22. Медведь, А. Н. Музеефикация памятниковархеологии в России : прошлое и настоящее / А. Н. Медведь. – М. : ГНОМ, 2004. – 80 с.
23. Методы консервации руинированных каменных сооружений (обзор отечественных и зарубежных источников) / Рос. гос. б-ка, НИО Информкультура. – М. : [б. и.], 1992. – 32 с. – (Консервация и реставрация недвижимых памятников истории и культуры : экспресс-информация ; вып. 3/4).
24. Минеева, И. М. Археологическое наследие: проблемы сохранения и использования / И. М. Минеева // Фундаментальные проблемы культурологи : [сб. ст. в 7 т.] / М-во культуры Рос. Федерации, С.-Петерб. отд-ние Рос. ин-та культурологии ; редкол.: Д. Л. Спивак (отв. ред.) [и др.]. – М.; СПб., 2009. – Т. 6 : Культурное наследие: от прошлого – к будущему. – С. 40–44.
25. Музейные термины // Терминологическиепроблемымузееведения: сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; редкол.: Т. Г. Шумная (отв. ред.) [и др.]. – М.: Б. и., 1986. – 136 с.
26. Недович, Н. Д. Из практики объединения «Росреставрация» по консервации и музеефикации памятников археологии / Н. Д. Недович, Л. А. Беляев // Методические основы охраны и использования памятников археологии : сб. науч. тр. / М-во культуры СССР, Науч.- метод. совет по охране памятников культуры ; [науч. ред. В. Л. Янин]. – М., 1987. – С. 120–126.
27. Почобут Н. А. Сохранение и изучение археологического наследия в музеях БССР (1944–1991 гг.) / Н. А. Почобут; науч. ред. С. П. Витязь; рецензенты: А. А. Гужаловский, Л. В. Колединский / Центр исследований белорусской культуры. языка и литературы НАН Беларуси; ОО «БДООПИК»; УК ГГИАМ. – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – 194 с.
28. Слюнченко, В. Г. Полоцкий Софийский собор : ист.-архит. Очерк / В. Г. Слюнченко. – Мінск: Полымя, 1987. – 48 с.
29. Стрыбульская, Н. Гарадзішча «Замэчак» – мінулае і сучаснасть / Н. Стрыбульская // Беларус. гіст. часоп. – 1995. – № 2. – С. 57–61.
30. Федоров-Давыдов, Г. А. Археологические музеи-заповедники : (проблемы и перспективы) / Г. А. Федоров-Довыдов, Н. М. Булатов // Методические основы охраны и использования памятников археологии СБ. науч. тр. /М-во культуры СССР, Науч.-метод. совет по охране памятников культуры ; [науч. ред. В. Л. Янин]. – М., 1987. – С. 111–120.
31. Шулепова, Э. А. Музеефикация памятников как механизм использования культурного наследия в регионе: дис. ... д-ра культурологии: 24.00.02 ; 24.00.03 / Э. А. Шулепова. – М., 1998. – 292 с.
32. Щерба, С. П. Археологический музей «Берестье»: история, современность, перспективы / С. П. Щерба // Брестчина: история и современность: сб. м-в. респ. науч.-практ. конф., Брест, 29–30 июня 2012 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: А. В. Митюков [и др.]. – Брест, 2012. – С. 12–15.
33. Bubieńko, T. Wieza Olgierda w Witebsku – wyniki badan, restauracja i uzytkowanie / T.Bubieńko // Zamki, grody, ruiny, Ciechanowiec 22–24.X.2009 : konf. Międzynar. Ser. : Architektura obronna / red. M. L. Lewicka. – Warszawa ; Bialystok, 2009. – T. III : Waloryzacja i ochrona. – S. 256–263.
34. Paardekooper, R. P.Archaeological open-air museums accross Europe. Their 125 years history and a debate on their future/ R. P. Paardekooper // Skanseny Archeologiczne i Archeologia Eksperymentalna :konf. naukową, Krosno, 22 lutego 2011 r. / Muzeum Podkarpackie w Krośnie. – Krosno, 2012. – P. 13–34.

# СТАТЫСТЫКА ПАРУШЭННЯЎ ЛЯСНОГА ЗАКАНАДАЎСТВА І ДЫНАМІКА КАЗЁННЫХ ЛЯСНЫХ ПЛОШЧАЎ ЯК КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ДЗЕЙНАСЦІ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА АХОВЕ ЛЯСОЎ У БЕЛАРУСІ (1840–1880-Я ГГ.)

***І. В. Пугач,***
*кандыдат гістарычных навук,*
*выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў*
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»*

У адзначаны час беларускія губерні, як і ў цэлым Расійская імперыя, перажывалі перыяд распадання феадальна-прыгонніцкіх і актывізацыі капіталістычных гаспадарчых адносін. Перад суб’ектамі эканомікі паўстала пытанне перабудовы гаспадарак на новы лад. Сярод іх адным з найбольш уплывовых з’яўлялася дзяржава. Важную ролю ў эканамічным жыцці беларускіх губерняў у 40–80-я гг. XIX ст. адыгрывала эксплуатацыя мясцовых прыродных рэсурсаў, сярод якіх асаблівае месца займалі лясныя. Лесаматэрыялы забяспечвалі патрэбы ўнутранага рынку, арміі, флоту і накіроўваліся на экспарт. У сваю чаргу арганізацыя

рацыянальнай, прыбытковай дзяржаўнай лясной гаспадаркі патрабавала наладжвання спецыяльнай сістэмы аховы лясоў. Цэнтральнае месца ў ёй адводзілася адпаведнай дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання. У гэты час яны ўжо атрымалі свой інстытуцыянальны выгляд. На цэнтральным узроўні ахова дзяржаўных лясоў каардынавалася спачатку II Дэпартаментам дзяржаўных маёмасцей, а з 1843 г. – Лясным дэпартаментам Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. На ўзроўні губерняў за арганізацыю лесаахоўнай дзейнасці адказвалі мясцовыя палаты (з 1866 г. – упраўленні) дзяржаўных маёмасцей. Непасрэдную дзейнасць па ахове казённых лясоў ажыццяўлялі лясныя чыноўнікі і лясная варта. Іх структура і дзейнасць рэгламентаваліся спецыяльным лясным заканадаўствам і шэрагам прававых рэгулятараў, як загады па Корпусе ляснічых, цыркулярныя прадпісанні Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, у прыватнасці Ляснога дэпартамента і інш.

Акрамя ўстанаўлення інстытуцыянальнага ўладкавання дзяржаўнай лясной адміністрацыі асаблівы інтарэс выклікае праблема ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання па ахове лясоў у Беларусі ў гэты час. Для яе вырашэння неабходным бачыцца вылучэнне пэўных спецыфічных крытэрыяў.

У якасці аднаго з такіх крытэрыяў можна лічыць статыстыку парушэнняў лясного заканадаўства. Адным з найбольш распаўсюджаных тыпаў лясных злачынстваў можна лічыць самавольныя высечкі. Так, у 1846 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў быў зафіксаваны 191 выпадак самавольных высечак, паводле якіх было незаконна нарыхтавана 9 354 будаўнічых дрэваў, жардзінаў і калоў і 266 саж$^3$ (альбо, прыблізна, 2 584 м$^3$) дроў розных родаў [6, арк. 18–19, 45–46; 9, арк. 16 адв., 40–41; 11, арк. 40 адв. – 42, 80–81; 14, арк. 21 адв.; 17, арк. 22, 50]. Пры гэтым, найбольшая колькасць незаконна нарыхтаваных лесаматэрыялаў была зафіксавана ў Віленскай губерні – 125 фактаў самавольных высечак, падчас якіх нарыхтавана будаўнічых дрэваў 5 944 шт. і 49 саж$^3$ дроў, а агульная шкода ад іх ацэньвалася ў 4 442 руб. У 1857 г. у Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях – 123 выпадкі на суму 9 308 руб., а ў 1856 г. у Мінскай і Магілёўскай губернях – 41 на суму 1 980 руб. Толькі ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях за 1856 і 1857 г. была зафіксавана незаконная нарыхтоўка звыш 15 000 будаўнічых дрэваў, жардзінаў і калоў і 596 саж$^3$ (5 789 м$^3$) галля і дроў [7, арк. 34 адв. – 35 адв.; 10, арк. 18 адв. – 19; 12, арк. 77 адв. – 78; 15, арк. 37 адв. – 38; 17, арк. 22].

Прадстаўленыя звесткі паказваюць тое, што дзяржаўнай лясной адміністрацыяй у адзначаны перыяд выкрываліся самавольныя высечкі буйных памераў. Пры гэтым, варта заўважыць, што, згодна са штогадовымі справаздачамі, у асноўным самавольныя высечкі праводзіліся мясцовым дзяржаўным сялянствам з мэтай задавальнення ўласных патрэбаў у лесаматэрыялах. Так у справаздачы Віленскай палаты дзяржаўных маёмасцей за 1846 г. адзначалася: «Главнейшая причина истребления лесов происходит от того, что казённые крестьяне не согласно нужд своих удовлетворяются лесными материалами на домашний обиход но для устранения и сего обстоятельства палата входила с представлением в Лесной департамент о изменении разрядов лесных дач, назначении отпуска лесных материалов по годовым сметам на продажу и безденежно, не придерживаясь той пропорции строевого и дровяного леса, какая исчислена к ежегодному отпуску в составленных в 1842 году хозяйственных описаниях, оказавшихся совершенно неверными и изменении порядка употребления строевого материала отпускаемого безденежно казённым крестьянам. Предположение таковое палаты утверждено товарищем министра и будет приведено в исполнение в 1847 году» [6, арк. 5 адв. – 6]. Падобныя тлумачэнні выкладзены ў справаздачах дзяржаўнай лясной адміністрацыі іншых губерняў [7, арк. 36–37 адв.; 10, арк. 19 адв.; 11, арк. 13–14 адв.; 15, арк. 39 адв. – 40; 17, арк. 6 адв. – 7]. Пры гэтым нельга выключаць і таго, што незаконная нарыхтоўка лесаматэрыялаў ажыццяўлялася сялянствам і з мэтай уласнага ўзбагачэння больш лёгкім незаконным шляхам. Пра гэта, напрыклад, паведамляе ў сваёй справаздачы Віцебская палата дзяржаўных маёмасцей за 1857 г.: «… Нельзя не упомянуть о лени государственных крестьян, которые делают всё, только бы не причинить труда в приобретении лесного материала законным способом…» [10, арк. 20]. У сваю чаргу, Гродзенскай палатай дзяржаўных маёмасцей паведамлялася: «… Хотя палата постоянно заботиться о своевременном и возможном обеспечении необходимых нужд в лесе государственных крестьян … главнейшие и частые самовольные порубки леса совершаются частными лицами и государственными крестьянами не по одной нужде в лесе для собственной надобности, но более из видов корысти, чему способствует свобода к продаже на рынках и базарах в ближайших городах и местечках похищенного материала, а также от медленного и несвоевременного

производства следствий по делам сего рода земскими полициями…» [12, арк. 80 адв. – 81 адв.]. У цэлым, пададзенае дае падставу меркаваць, што колькасць адзначаных парушэнняў магла быць значна большая, а самі высечкі павінны былі мець дробны характар. Такім чынам, адзначаная акалічнасць сведчыць аб тым, што самавольныя высечкі дробнага характару выпадалі з увагі мясцовай дзяржаўнай лясной адміністрацыі. У сваю чаргу, яе можна лічыць своеасаблівым сведчаннем недастаткова эфектыўнага нагляду за лясамі.

Аднак ужо да канца 70-х – пачатку 80-х гг. XIX ст. сітуацыя змянілася. Так, да 1 студзеня 1879 г. разбору чакалі 5 394 спраў па парушэннях ляснога заканадаўства на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў (па Віцебскай губерні ўстанавіць даныя не ўдалося). Варта адзначыць, што 63,81 % (3 442 справы) прыходзіліся на злачынствы, сумма спагнанняў па кожным з якіх складала менш за 3 руб., 19,47 % (1 050 спраў) – ад 3 да 10 руб., 10,07 % (543 справы) – ад 10 да 30 руб., 6,28 % (339 спраў) – ад 30 да 100 руб., 3,71 % (20 спраў) – ад 100 руб. і вышэй. Пры гэтым, за ўвесь 1879 г. было зафіксавана 5 405 спраў. З іх 79,17 % (4 279 спраў) прыходзіліся на самавольныя высечкі, 18,04 % (975 спраў) – на незаконны выпас жывёлы і іншыя пашкоджанні лясоў, 1,79 % (97 спраў) – на парушэнні правілаў гаспадарання і безбілетны сплаў, каля 1 % (54 справы) – на пажары [8, арк. 20 адв. – 22 адв.; 13, арк. 39 адв. – 40; 16, арк. 83–84; 19, арк. 20 адв. – 22 адв.]. У 1883 г. на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў была зафіксавана 10 481 справа на агульную сумму 36 725 руб. [2, с. 1–8]. Па-ранейшаму, найбольш распаўсюджаным тыпам парушэнняў ляснога заканадаўства з'яўляліся самавольныя высечкі (77,19 % у 1883 г., 79,39 % у 1884 г. ад агульнай колькасці зафіксаваных парушэнняў). Пры гэтым, на падставе даных справаздач за 1879, 1883–1884 гг. можна зрабіць выснову аб тым, што на другім месцы па распаўсюджанасці былі незаконны выпас жывёлы ў казённых лясах і іншыя пашкоджанні лясоў (18,04 % у 1879 г., 19,34 % у 1883 г., 15,74 % у 1884 г. ад агульнай колькасці зафіксаваных парушэнняў). Адной з прычын такога становішча рэчаў можна лічыць дрэннае забеспячэнне сялянства лесаматэрыяламі і сенажацямі. Пры гэтым, можна заўважыць значны рост выкрытых злачынстваў. У 1879 г. – 63,81 %, 1883 г. – 75,62 %, 1884 г. – 78,46 % прыходзілася на злачынствы, суммы спагнанняў па якіх складалі менш за 3 руб. На суммы спагнанняў ад 3 да 10 руб. прыходзілася 19,47 %, 17,87 % і 15,41 % ад агульнай колькасці зафіксаваных парушэнняў адпаведна. Трэба заўважыць, што ў 1879 г. на адказнасць лясной варты было аднесена 352 з 894 спраў, па якіх не былі ўстаноўлены вінаватыя, ці 39,37 % ад агульнай колькасці ўсіх адпаведных спраў, якія разглядаліся ўпраўленнямі дзяржаўных маёмасцей згаданых губерняў. Аднак, у сукупнасці з тым, што значная доля лясных злачынстваў выкрывалася менавіта прадстаўнікамі лясной варты і ляснічымі (у 1879 г. на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў імі было зафіксавана 5 350 з 5 405 выкрытых парушэнняў, ці 98,98 %) можна лічыць, што ў пэўнай ступені на гэта паўплывалі якасныя трансфармацыі ляснога чыноўніцтва і лясной варты ў парэформенны перыяд [1, с. 1–8; 8, арк. 20 адв. – 22 адв.; 13, арк. 39 адв. – 40; 16, арк. 83–84; 19, арк. 20 адв. – 22 адв.].

Пры гэтым, трэба мець на ўвазе, што акрамя адзначанага ў пэўнай ступені да пашкоджання лясоў вялі ненаўмысныя лясныя пажары прычыненыя неасцярожным абыходжаннем з агнём. Так, яшчэ ў 1839–1840 гг. адзначалася: «… Чрезмерное истребление лесов причиняется пожарами, происходящими от неосторожности. Пожары, возникающие в лесах могут быть предупреждены только строгим надзором за неосторожными и крайне небрежными действиями поселян и промышленников, разводящих огни в лесах. Весьма пагубный для лесов обычай разводить огни внутри их во время пастьбы скота для защиты от насекомых. При этом для защиты огней от ветра, огни разводятся у самых корней обыкновенно толстомерных деревьев, таким образом, подожжённые деревья воспламеняются или гибнут на корню и от сего нередко происходят пожары, каковые тушатся весьма неудачно. Подобным образом разводят огни в летнее время разные промышленники и проезжающие, которые не соблюдают никаких правил осторожности…» [5, арк. 1–1 адв.]. Пэўным чынам страты лясных тэрыторый былі вынікам захадаў урада па папярэджанні распаўсюджвання паўстання на беларускіх землях. Так, з мэтай аховы чыгункі, было прынята рашэнне расчышчаць лясы вакол станцый на 300 саж. ва ўсе бакі, а на працягу самой чыгункі на 150 саж. у абодва бакі. Для рэалізацыі гэтага захаду было прынята рашэнне аб арганізацыі спецыяльных атрадаў сялян бліжэйшых пасяленняў з прызначэннем ім сумы ў 30 кап. штодзённа. Высечаны лес складваўся ў штабелі для далейшага гаспадарчага выкарыстання. Пры гэтым, высечцы падлягалі дробны і густы лес і частыя хмызнякі, а вялікія дрэвы пакідаліся незакранутымі [20,

с. 200–201]. Была распаўсюджана практыка выкарыстання сялян для пошуку зброі, пакінутай паўстанцамі ў тым ліку і ў казённых лясах, якія знаходзіліся паблізу ад іх пасяленняў [20, с. 238–241]. Можна меркаваць, што допуск вялікай колькасці сялянства ў лясы мог ствараць спрыяльныя ўмовы для незаконнага лесакарыстання.

Неабходна заўважыць, што ўсё адзначанае нельга ацэньваць без уліку дынамікі змянення плошчы казённых лясоў края. Так, было ўстаноўлена, што ў адзначаны перыяд плошча казённых лясных дач на тэрыторыі беларускіх губерняў павялічылася з 1 783 269 (па іншых звестках – 1 774 262) дзес. у 1840 г. да 2 141 194 дзес. у 1883–1884 гг. [1, с. 3; 3, арк. 139; 4, арк. 89–91 а адв., 93–102б, 219–237 а адв., 334, 336–337 адв., 359–361 адв., 367–368, 370–371; 6, арк. 1, 33; 7, арк. 1–1 адв., 56 адв. – 58; 8, арк. 1–4, 42–45; 9, арк. 3, 31–31 адв.; 10, арк. 1, 30; 11, арк. 1–2 адв., 69–69 адв.; 12, арк. 1–2, 113–113 адв.; 13, арк. 1, 60–63; 14, арк. 1–2, 45–45 адв.; 15, арк. 2, 61–62; 16, арк. 1–3, 16–33; 17, арк. 1–1 адв., 33–33 адв.; 18, арк. 2, 53; 19, арк. 2–4 адв., 36–43]. Трэба ўлічваць, канечне, што прырост колькасці лясоў, якія знаходзіліся пад наглядам дзяржаўных органаў кіравання, пэўным чынам быў звязаны з палітыкай урада па канфіскацыі нерухомай маёмасці, у тым ліку і лясоў, іншых маёмасных статусаў (маёнткі Таварыства Ісуса, удзельнікаў антыўрадавых выступленняў і г. д.). Аднак, адсутнасць істотнага памяншэння плошчы казённых лясоў і, нават яе павелічэнне на працягу 1840–1880-х гг., у перыяд узмацнення эксплуатацыі дзяржавай падуладных лясных рэсурсаў, пры адначасовым павелічэнні колькасці выкрытых парушэнняў ляснога заканадаўства можна інтэрпрэтаваць як станоўчыя наступствы намаганняў урада ў справе арганізацыі дзейснай сістэмы нагляду за казёнными лясамі. З аднаго боку, яна істотна папярэджвала незаконную эксплуатацыю лясоў края і мінімізавала шкоду ад лясных пажараў, у першую чаргу праз забеспячэнне дзейнасці мясцовага ляснога чыноўніцтва і інстытута лясной варты. З другога боку, адзначаная сістэма забяспечвала цэласць лясоў шляхам рэалізацыі захадаў па арганізацыі рацыянальнай лясной гаспадаркі.

Такім чынам, на падставе адзначанага можна зрабіць выснову аб тым, што колькасць парушэнняў ляснога заканадаўства і дынаміка плошчы казённых лясоў ў Беларусі ў 40–80-я гг. XIX ст. з'яўляюцца важнымі крытэрыямі ацэнкі эфектыўнасці лесаахоўнай дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання ў краі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС**


1. Ведомость № 1 «Общая площадь лесных дач по губерниям и по группам губерний» // Отчёт по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1883 и 1884 гг. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типография Морского министерства, 1886. – 4 с.
2. Ведомость № 7 «Данные о делах по нарушениям Лесного устава» // Отчёт по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1883 и 1884 гг. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типография Морского министерства, 1886. – 8 с.
3. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбурзе (далей – РДГА). – Ф. 384. Воп. 2. Спр. 991.
4. РДГА. – Ф. 387. Воп. 1. Спр. 4075.
5. РДГА. – Ф. 387. Воп. 1. Спр. 7059.
6. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1289.
7. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1290.
8. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1291.
9. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1292.
10. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1293.
11. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1312.
12. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1313.
13. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1314.
14. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1340.
15. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1341.
16. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1342.
17. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1343.
18. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1344.
19. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1345.

20. Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьёва по усмирению польского мятежа в северо-западных губерниях 1863–1864 / сост. Н. Цылов. – Вильна: типография А. Киркора и бр. Роммов, 1866. – [2], IV, 383, [1] с.

# СОХРАНЕНИЕ ПАМЯТИ О ПОДВИГЕ: КАЗАХСТАНЦЫ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

***А. Ф. Ратько,***
*кандидат исторических наук, доцент,*
*доцент кафедры истории Беларуси и славянских народов*
*УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка;*
***М. Ю. Романюк,***
*студентка 2-го курса исторического факультета*
*УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка*

На всём постсоветском пространстве практически нет семьи, которой бы не коснулась Великая Отечественная война. С момента изгнания врага с нашей земли прошло уже более 75 лет. Представителей поколения фронтовиков, партизан, подпольщиков, тружеников тыла и очевидцев войны становится всё меньше. В таких условиях важным является сохранение памяти о подвиге советских людей в те суровые годы. 4 июля 2014 г. постановлением № 534 Совета Министров Республики была принята к реализации Государственная программа на 2015–2020-е годы по увековечению погибших при защите Отечества и сохранению памяти о жертвах войн, в том числе и Великой Отечественной войны. Программа направлена «на гражданско-патриотическое воспитание, формирование уважительного отношения к погибшим при защите Отечества, событиям, вошедшим в историю Беларуси как символы героизма, мужества, стойкости и самопожертвования народа» [13].



*Рисунок 1. – Памятник воинам-казахстанцам, сражавшимся и погибшим в годы Великой Отечественной войны на территории Беларуси*

В годы Великой Отечественной войны на территории Беларуси плечом к плечу с русскими, белорусами, украинцами и жителями других оккупированных врагом районов сражались узбеки и башкиры, киргизы и татары, грузины и армяне, азербайджанцы и туркмены – сыновья и дочери других народов Советского Союза. Большую роль в борьбе с врагом на белорусской земле сыграли уроженцы Казахстана. Беларусь помнит тех казахстанцев, которые ценой собственной жизни отстаивали победу. Имена героев этой